■ Энергетыка

# ЗАХАВАЦЬ ГРАНІЧНА НІЗКІЯ ТАРЫФЫ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА



### На XXI Беларускім энергетычным і экалагічным форуме вызначаліся прыярытэты ў развіцці энергасістэмы да 2020 года

**Апошнія дамоўленасці з Расіяй па газе дапамогуць у далейшым зніжаць тарыфы для рэальнага сектара эканомікі, паведаміў міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК на пленарным пасяджэнні Беларускага энергетычнага і экалагічнага форуму.**

У прыватнасці ён адзначыў, што «з улікам прынятага рашэння і падпісанага пратакола адкрываюцца выдатныя перспектывы па далейшым зніжэнні выдаткаў і тарыфаў для рэальнага сектара эканомікі». Паводле разлікаў Мінэнерга, пры кошце газу 117 долараў за 1 тысячу кубічных метраў можна забяспечыць прымальныя тарыфы для рэальнага сектара эканомікі пры захаванні гранічна нізкіх тарыфаў на цеплавую і электрычную энергію для насельніцтва. «Пры гэтым 117 долараў за 1 тысячу кубаметраў — гэта ў 2 разы вышэй, чым цана газу для расійскіх энергетыкаў, што сведчыць аб велізарным запасе трываласці беларускай энергасістэмы», — падкрэсліў Уладзімір Патупчык.

### Выключна ўласная электрычнасць

Больш таго, міністр паведаміў, што наша краіна з 2019 года цалкам адмовіцца ад імпарту ў балансе электраэнергіі. Яшчэ зусім нядаўна мы імпартавалі да 7 млрд кВт·гадз, што складала значную долю ў спажыванні электраэнергіі ўнутры краіны. Энергетыкі адзначаюць, што за апошнія гады імпарт электраэнергіі знізіўся амаль у тры разы — з 7,9 млрд кВт·гадз у 2012 годзе да 2,8 млрд кВт·гадз у 2015 годзе.

Паводле слоў міністра, праведзеная мадэрнізацыя беларускай энергасістэмы дае магчымасць штогод эканоміць каля 150 млн кубаметраў імпартуемага прыроднага газу, што эквівалентна 24 млн долараў. Вынікам рэалізацыі энергаэфектыўных праектаў таксама стала зніжэнне выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу, у тым ліку дыяксіду серы больш чым у два разы і аксіду азоту амаль у 1,5 раза.

### Мясцовыя віды паліва і «ветракі»

Уладзімір Патупчык таксама звярнуў увагу, што ў Беларусі расце доля выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі. Калі ў 2011 годзе сумарная ўстаноўленая магутнасць ветраэнергетычных установак складала 1,6 МВт, то ў 2016 годзе эксплуатуецца 68 такіх установак магутнасцю 59,3 МВт. Летась гэтымі ўстаноўкамі пастаўлена ў агульную энергасістэму краіны 38,4 млн кВт·гадз электраэнергіі, што дазволіла замясціць 8,7 млн «кубоў» прыроднага газу і скараціць выкіды забруджвальных рэчываў на 19,2 тысячы тон.

Ужо сёлета ў Навагрудскім раёне Гродзенскай вобласці запушчана адна з найбуйнейшых у краіне ветраэнергетычных станцый. Яе работа дапаможа энергасістэме штогод эканоміць каля 5 млн «кубоў» газу і скараціць выкіды забруджвальных рэчываў дадаткова на 10,9 тысячы тон у год.

Міністр адзначыў, што паспяхова развіваецца ў краіне і тарфяная галіна. Запланавана, што да 2020 года торфапрадпрыемствы значна павялічаць здабычу торфу для вытворчасці брыкетаў і тарфяной сушанкі (фрэзерны торф). Цяпер прапрацоўваецца магчымасць стварэння энергакрыніц з выкарыстаннем тарфянога паліва на аб'ектах ЖКГ Мінскай і Гродзенскай абласцей.

### Запуск АЭС скароціць імпарт газу

«Пасля рэалізацыі ў 2016—2020 гадах дзяржаўных праектаў у структуры вызначанай магутнасці аб'яднанай энергасістэмы доля энергакрыніц, якія працуюць на прыродным газе, знізіцца да 2021 года з 97% да 70-75%», — паведаміў Уладзімір Патупчык. Энергетычная палітыка ў найбліжэйшай перспектыве будзе накіравана на зніжэнне тарыфаў і ўдзельных выдаткаў на выпрацоўку энергіі.

Галоўнымі прыярытэтамі ў развіцці энергасістэмы да 2020 года будзе запуск Беларускай АЭС магутнасцю 2400 МВт, увод высокаэфектыўных генерыруючых магутнасцяў каля 350 МВт, рэалізацыя мерапрыемстваў па інтэграцыі атамнай станцыі ў баланс энергасістэмы і развіццё электрасетак. У найбліжэйшай пяцігодцы прадугледжаны праекты па выкарыстанні мясцовых відаў паліва. Напрыклад, на Мазырскай ЦЭЦ прапрацоўваецца ўстаноўка катлаагрэгата магутнасцю 150 МВт з выкарыстаннем тарфянога паліва, завяршаецца будаўніцтва Полацкай і Віцебскай ГЭС сумарнай магутнасцю больш за 60 МВт. Рэалізацыя праектаў, прадугледжаных галіновай праграмай развіцця энергасістэмы на 2016—2020 гады, дасць магчымасць дасягнуць эканоміі паліўных рэсурсаў да 850 тысяч тон умоўнага паліва.

Гаворачы аб будаўніцтве АЭС, Уладзімір Патупчык звярнуў увагу, што вытворчасць электраэнергіі на станцыі ў базавым рэжыме складзе каля 18 млрд кВт·гадз у год. Уласная атамная электрастанцыя дасць магчымасць штогод замяшчаць каля 5 млрд «кубоў» прыроднага газу. Выкіды парніковых газаў знізяцца на 7—10 млн тон у год. «Развіццё атамнай энергетыкі — гэта новы інтэлектуальны і тэхналагічны імпульс у развіцці краіны і забеспячэнні дадатковых гарантый умацавання незалежнасці і эканамічнай самастойнасці», — упэўнены міністр.

XXI Беларускі энергетычны і экалагічны форум працаваў у Мінску 11—14 кастрычніка. Праграма форуму ўключала пленарнае пасяджэнне, міжнародных канферэнцый, навукова-практычныя семінары і прэзентацыі кампаній-удзельнікаў выставы.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Сітуацыя

## ЧАМУ НАШЫ ЛІФТЫ НЕ ЕДУЦЬ У РАСІЮ?

**У Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю паступіла інфармацыя ад Міністэрства прамысловасці Беларусі аб абмежаванні канкурэнцыі на трансгранічным рынку ліфтавага абсталявання.**

Так, Міністэрствам прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі ў жніўні бягучага года быў накіраваны рэкамендацыйны ліст рэгіянальным фондам капітальнага рамонту шматкватэрных дамоў аб прыярытэтным укараненні расійскага ліфтавага абсталявання, што не дазваляе беларускім вытворцам ліфтаў пастаўляць на рынак Расіі свае апошнія распрацоўкі, у тым ліку з выкарыстаннем расійскіх матэрыялаў і камплектуючых, паведамляе прэс-служба Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. У такога кшталту дзеяннях бачацца прыкметы парушэння артыкула 75 «Агульныя прынцыпы канкурэнцыі» Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. У адрас Федэральнай антыманапольнай службы Расіі накіраваны ліст аб ацэнцы адпаведнасці дзеянняў Міністэрства прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі гэтаму Дагавору і Закону Расійскай Федэрацыі «Аб абароне канкурэнцыі» і прыняцці адпаведных мер.



**Сяргей РАСОЛЬКА**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 15 ноября 2016 года в 10.00 по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.**

**Организатором аукциона является республиканское унитарное предприятие**

**«Отель «Минск»,**

**находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, д. 11, корп. 1, каб. 221.**

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

Часть нежилого помещения №28 (вестибюль), арендуемой площадью **2,2** кв.м, на первом этаже в изолированном помещении по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 в г. Минске; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 7,48 рубля (семь рублей сорок восемь копеек); размер задатка – 0,75 рубля (ноль рублей семьдесят пять копеек); целевое использование – **для организации розничной торговли непродовольственными товарами**; ставка арендной платы за 1 кв.м – 40,80 рубля (сорок рублей восемьдесят копеек).

**Документы на участие в аукционе принимаются с 17 октября 2016 года по 14 ноября 2016 года с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 14 ноября 2016 года, не рассматриваются.**

Порядок проведения аукциона определён Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

*- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 1 500,00 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (+37517) 209-90-93, 209-92-78.**


■ З нагоды

# ЛЕКІ НА ЭКСПАРТ

### Фармацэўты расказалі пра перспектывы сваёй галіны

**Рэнтабельнасць айчыннай фармацэўтычнай прамысловасці складае сёлета 18 працэнтаў. 25 працэнтаў фармпрадукцыі адпраўляецца на знешнія рынкі ў 29 краін, ільвіная доля экспарту прыпадае на Расію. Але экспарт ажыццяўляюць толькі чвэрць з 49 ліцэнзаваных прадпрыемстваў — галоўным чынам гэта дзяржаўныя прадпрыемствы, такія як Барысаўскі завод медпрэпаратаў, дзе экспарт складае больш за 40 працэнтаў, і «Белмедпрэпараты» — 35 працэнтаў адпаведна. За 8 месяцаў гэтага года аб'ём экспарту склаў 74 млн долараў.**

У краіне зарэгістравана больш за 5 тысяч найменняў лекавых сродкаў, 32 працэнты з іх — айчынныя. Доля айчынных лекаў на ўнутраным рынку ў коштавым выражэнні — 52 працэнты. Імпарт толькі летась зменшыўся на 236 млн долараў. Забеспячэнне ўнутранага рынку было прыярытэтным у мінулую пяцігодку, а таму доля айчынных прэпаратаў вырасла амаль на 22 працэнты. У бліжэйшыя гады ў прыярытэце будзе ўжо знешні рынак, куды ў 2020-м павінна адпраўляцца 40 працэнтаў фармпрадукцыі (у коштавым выражэнні). Доля ўнутранага рынку прырасце да таго часу максімум на 5 працэнтаў. Сёння, у Дзень работнікаў фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прамысловасці, спецыялісты падрабязней расказваюць аб стане галіны.

— З 2011-га па 2015 год у краіне рэалізавана 25 інвестыцыйных праектаў па мадэрнізацыі і стварэнні вытворчасцяў агульным аб'ёмам інвестыцый у 195 млн долараў, — кажа **начальнік упраўлення арганізацыі вытворчасці і перспектыўнага развіцця Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Таццяна ТУМЕЛЯ**. — Летась было завершана 13 інвестпраектаў. На рынак выведзена за пяць гадоў 537 новых лекавых сродкаў — антыбактэрыяльных, супрацьгрыбковых, для лячэння сардэчна-сасудзістых захворванняў. Сумесна з транснацыянальнымі кампаніямі асвоена вытворчасць супрацьпухліннага сродку, імунадэпрэсанту. Сярод новых лекавых сродкаў, выведзеных на рынак у гэтым годзе, — створаная сумесна з расійскім бокам супрацьгрыпозная вакцына... Сёлета будуць завершаны інвестыцыйныя праекты па будаўніцтве корпуса прадпрыемства «Лекфарм», новага завода па вырабе супрацьпухлінных прэпаратаў «Націвіты» і новай вытворчасці лекаў у аэразолях «Фарцівамед». Налета плануецца завяршыць яшчэ сем праектаў з агульным аб'ёмам інвестыцый каля 30 млн долараў. За чатыры папярэднія гады аб'ём вытворчасці лекавых прэпаратаў вырас у 1,5 раза ў доларавым эквіваленце...

Па ацэнцы міжнародных экспертаў, стварэнне высокарэнтабельнай уласнай фармацэўтычнай прамысловасці ў краіне з насельніцтвам да 10 млн жыхароў з'яўляецца эканамічна неабгрунтаваным. «Таму ў прыярытэце — развіццё супрацоўніцтва па фарміраванні прынцыпаў і правілаў абароту лекавых сродкаў у межах Еўразійскага эканамічнага саюза, — удакладняе **начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла РЭУЦКАЯ**. — Адпаведнае пагадненне было падпісана краінамі-ўдзельніцамі яшчэ ў 2014-м, і на яго падставе рабочая група экспертаў распрацавала на аснове лепшых міжнародных практык звыш 20 дакументаў. Гэта правілы экспертызы і рэгістрацыі, патрабаванні да маркіроўкі, сістэма належных практык і г.д. З наступнага года пачне дзейнічаць агульны рынак абароту лекавых сродкаў з адзінай рэгістрацыяй.

Працэс пераходу — да 2025 года — запатрабуе вялікіх намаганняў і фінансавых затрат, у тым ліку на падрыхтоўку і адукацыю персаналу, набыццё спецыяльнага абсталявання, якога пакуль няма ў нашай краіне. Урэшце, новаўвядзенне сэканоміць і час, і грошы фармпрадпрыемствам.

**Святлана БАРЫСЕНКА**
*protas@zviazda.by*